Пралетары! Усіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 251 (320) АЎТОРАК 29 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АГІТАВАЦЬ ЯРКА, ПЕРАКАНАЎЧА!

Кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у нашай вобласці набывае ўсё больш і больш размах. У асноўным закончана стварэнне выбарчых камісій. Тысячы людзей — патрыётаў соцыялістычнай радзімы — уцягнуты ў работу. Тысячы агітатараў, партыйных і непартыйных большэвікоў, выйшлі на выбарчыя ўчасткі і праводзяць гутаркі з насельніцтвам.

На сучасным этапе кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы асноўным звяном у агітацыйнай рабоце з'яўляецца правядзенне ў шырокіх слаях працоўных вывучэння Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Гарадскімі і раённымі камітэтамі партыі для шырокага разгортвання агітацыйнай работы на прадпрыемствах, установах, калгасах, соўгасах, МТС і вёсках праведзен рад неабходных арганізацыйных мерапрыемстваў. Кожная партыйная арганізацыя прымацавана да пэўнага выбарчага ўчастка. Агітатары падрыхтаваны на кароткатэрміновых семінарах. Пры кожнай партыйнай арганізацыі створан агітацыйны калектыў. З кіраўнікамі агіткалектываў праведзены інструкцыйныя нарады. Уся работа партыйных кабінетаў накіравана на аказанне практычнай дапамогі агітатарам. У іх створаны ўсе ўмовы для глыбокай падрыхтоўкі да гутарак і бясед кожнага агітатара. Агітатары атрымалі план першых гутарак па вывучэнню выбарчага закона з насельніцтвам.

Рад пярвічных партыйных арганізацый, якія не спынялі работы з насельніцтвам з дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, паспелі правесці ўжо значную работу на выбарчых участках. Да такіх можна аднесці пярвічную партарганізацыю Дзяржаўнага банка, абласнога саюза прамысловай кааперацыі, міліцыі, чыгуначнай ст. Беласток і іншыя. Але трэба адзначыць, што ўвогуле агітацыйная работа сярод насельніцтва яшчэ дастаткова не разгорнута. Калі на самых прадпрыемствах, як на 6-м тэкстыльным камбінаце, 11-й прадзільнай фабрыцы, на лапскім паравоза-вагонарамонтным заводзе і іншых, у цэхах праводзіцца сістэматычна агітацыйная работа, то тэтага яшчэ нельга сказаць пра выбарчыя ўчасткі. Ёсць яшчэ нямнога пярвічных партыйных арганізацый, агіткалектывы якіх паспелі цесна звязацца з выбаршчыкамі, вядуць з імі групавыя і індывідуальныя гутаркі. Задача гарадскіх і раённых камітэтаў партыі — зараз-жа забяспечыць правядзенне глыбокай палітычнай работы ў масах. Кожная партыйная арганізацыя павінна патрабаваць ад сваіх агітатараў сапраўды большэвіцкай работы па правядзенню вывучэння з выбаршчыкамі Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Разам з гэтым партыйныя арганізацыі павінны забяспечыць умовы для падрыхтоўкі агітатараў і правяраць, як яны на справе старанна рыхтуюцца да правядзення гутарак. Работа агіткалектываў павінна забіць поўным ключом. Задачу падрыхтоўкі агітатараў ні ў якім разе нельга недаацэньваць. Толькі па гораду Беластоку агітацыйную работу будуць весці каля 3-х тысяч чалавек. Сярод іх вядучае месца займаюць камуністы і камсамольцы. Але ў лік агітатараў многа ўцягнута беспартыйных актывістаў грамадскіх арганізацый, як МОПР'а, прафсаюзаў і совецкай інтэлігенцыі. З іх многія упершыню будуць несці ў масы палкія словы большэвіцкай праўды.

Партыя Леніна — Сталіна пытанням агітацыі заўсёды надае самую выключную ўвагу. Яна патрабуе ад сваіх членаў самай сур'ёзнай, глыбокай падрыхтоўкі да гутаркі, яснага, простага і яркага правядзення яе. «Яснасць прапаганды, агітацыі, — указваў Уладзімір Ільіч Ленін, — ёсць асноўная ўмова. Калі нашы праціўнікі гаварылі і прызнавалі, што мы зрабілі цуды у развіцці агітацыі і прапаганды, то гэта трэба разумець не знешнім чынам, што у нас было многа агітатараў і было выдаткавана многа паперы, а гэта трэба разумець унутраным чынам, што тая праўда, якая была у гэтай агітацыі, прабівалася у галаву ўсіх». І ад гэтай праўды адхіліца нельга. Такія патрабаванні прад'яўляе наша партыя да сваіх большэвіцкіх агітатараў.

Наш агітатар мае вялікі выдатны арсенал сродкаў большэвіцкай агітацыі. Перш за ўсё, ён распалагае нашай гераічнай рэчаіснасцю, якая кожнага працоўнага захапляе творчым энтузіязмам у соцыялістычным будаўніцтве. Наша рэчаіснасць сапраўды гераічная. Мы ўсе — байцы вялікай арміі Леніна — Сталіна, якая нясе ўсяму свету новыя асновы жыцця. Гэтыя асновы жыцця назаўсёды ўмацаваны у нашай краіне пабудовай соцыялістычнага грамадства. У арсенале агітатара вялікі запас фактаў выдатнай работы лепшых людзей нашай краіны, людзей, якія інтарэсы соцыялістычнай радзімы, совецкага народа паставілі вышэй інтарэсаў свайго асабістага жыцця. Для іх лініі партыі з'яўляецца зместам іх жыцця. Агітатар мае велізарную суму фактаў найвялікшых перамог соцыялістычнага будаўніцтва нашай краіны ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, якія атрыманы за годы сталінскіх пяцігодак. Агітатар узброен вялікімі перспектывамі будаўніцтва камунізма, да якога наша краіна ажыццяўляе паступовы пераход. Усё гэта дае магчымасць кожнаму партыйнаму і непартыйнаму большэвіку весці агітацыю ярка, змястоўна, пераканаўча.

Агітацыйная работа на выбарчых участках павінна быць непарыўна звязана з падрыхтоўкай да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, з задачамі далейшага ўмацавання ваеннай і гаспадарчай магутнасці нашай радзімы, з раз'ясненнем пытанняў міжнароднай абстаноўкі.

У гутарках у цэху, на кватэрах рабочых, у чырвоных кутках, у індывідуальных гутарках, агітатар павінен усю сілу большэвіцкага слова накіроўваць на далейшае ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, павышэнне прадукцыйнасці працы. Агітатар павінен з усёй рашучасцю выкрываць і бічаваць прагульшчыкаў, лодыраў, дэзарганізатараў соцыялістычнай вытворчасці. Яшчэ ў нашых умовах мы можам чуць зьміное шыпенне асколкаў разбітых контррэволюцыйных буржуазных нацыяналістычных партый і іх подлай агентуры. Гэтыя агідныя слугі капіталістаў і памешчыкаў парой не супроць пусціць самы агідны паклёп, спрабаваць нацкоўваць маласвядомых людзей з-за вугла, каб перашкодзіць справе соцыялістычнага будаўніцтва. Задача агітатара — на зямлі і даходліва да мас мове давесці ўсю шкоднасць і варожасць для народа гэтых патуг падонкаў разгромленых капіталістычных класаў. Большэвік агітатар, выкрываючы ўсе і ўсякія прошукі класавых ворагаў, павінен узброіваць працоўных большэвіцкай пільнасцю і па-большэвіцку настойліва раз'ясняць абстаноўку, у якой нашай краіне прыходзіцца непахісна ўзнімаць соцыялістычнае будаўніцтва на новую вышэйшую ступень, рашуча пераматаючы на гэтым шляху чарговыя цяжкасці. Большэвіцкая прынцыповасць, прамата, смеласць, наступальнасць супроць перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей — гэта павінна характарызаваць якасць работы агітатара.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі, кіраўнікі агіткалектываў у цэнтры сваёй увагі павінны паставіць задачу забеспячэння высокай большэвіцкай якасці агітацыі, яе завостранасць.

КУРСЫ АГІТАТАРАЎ ПРЫ БЕЛАСТОЦКІМ ДОМЕ ПАРТАСВЕТЫ

Пры беластоцкім Доме партыйнай асветы былі праведзены чатырохдзённыя курсы агітатараў. Праз курсы прайшло 160 чалавек. Агітатары азнаёміліся з Палажэннем аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і праслухалі рад лекцый і дакладаў на тэмы: «Аб дасягненнях у жыцці г. Беластока за год совецкай улады», «Формы і метады агітацыйнай работы», «XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі». Большасць агітатараў прыступілі ўжо да агітацыйнай работы на ўчастках.

Аднача з гэтымі курсамі праходзіць семінар для агітатараў інтэлігенцыі. Семінарам ахоплена 105 чалавек.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ



Сакратар партарганізацыі 2-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната О. І. Дзянісава праводзіць з агітатарамі гутарку аб рабоце на выбарчых участках.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА

Агітатар

У пакой, дзе звычайна рабочыя праводзяць абедзены перапынак, Бела Ліпаўна Перэй прыйшла загадзя. Яна яшчэ раз прагледзела свежы нумар газеты. Сёння гутарка незвычайная — аб прадстаячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Хутка пачаўся і перапынак. Работніцы расселіся навокал стала. Чуваць гучны голас, вясёлае ажыўленне. Калі агітатар падышла да стала, у пакоі стала ціха. Яна абвясціла аб тэме гутаркі. Тав. Перэй растлумачыла сутнасць прадстаячых выбараў. Паступова ў гутарку ўключаюцца слухачы.

Як выбіралі ў былой Польшчы? — пытаецца тав. Перэй.

— Давайце, я адкажу, — прапанавала адна работніца.

— Правільна, — пацвярджае Бела Ліпаўна, калі работніца закончыла свой расказ.

Затым пачынаецца гутарка аб выбарах у панскай Польшчы. Пытанне зразумела для ўсіх.

Тав. Перэй добра ведае складаную механіку выбараў у былой Польшчы. Зразумела і даходліва яна растлумачвае гэта рабочым, падкрэслівае, што працоўнаму чалавеку трапіць у органы ўлады было вельмі цяжка. Узяць хаця-б выбары ў сенат. Туды маглі трапіць толькі вышэйшыя чыноўнікі, бо для таго, каб быць выбраным, патрабавалася і вышэйшая адукацыя, і заслугі перад дзяржавай, і 30-гадовы ўзрост і рад іншых абмежаванняў.

Бела Ліпаўна Перэй — начальнік планавага аддзела 11-й прадзільнай фабрыкі. Тут яна працуе параўнаўча нядаўна — усяго некалькі месяцаў. Але стаж яе агітацыйнай работы значна большы. Яшчэ ў перыяд выбараў у Народнае Сабранне яна была даверанай асобай. У выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР тав. Перэй прымала актыўны ўдзел: выпускала насценгазету, агітавала за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Пасля сканчэння курсаў планавікоў тав. Перэй была накіравана на фабрыку № 11, дзе яна таксама прынялася за агітацыйную работу.

Веданне лекальных моў дапамагае ёй у правядзенні агітацыі. Яна сочыць за газетамі «Праўда», «Штандар вольносці» і іншымі. Штодзённа ў час абедзенага перапынку тав. Перэй арганізоўвае гласныя чыткі газет.

Бела Ліпаўна выпрацавала свой метад заняткаў. Яе гутаркі заўсёды праходзяць жыва, арганізавана. Яна лічыцца з узроўнем і запатрабаваннямі сваіх слухачоў, гутаркі агітатара праводзіць зразумела, даходліва і красамоўна.

Цяпер тав. Перэй намячае арганізаваць калектыўны паход рабочых у кіно. Гэта будзе вялікім дадаткам да агітацыйнай работы.

І. Ісакаў.

Заняткі праходзяць змястоўна і цікава

Калектыў станцыі Гродна шырока разгарнуў работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Агітатарамі для работы на участках і прадстаўніцтвам ў акруговыя камісіі вылучана 60 чалавек — лепшых стаханаўцаў, перадавікоў вытворчасці. Сярод іх дзяжурны па станцыі тав. Зайцаў, саставіцель паяздоў Кашкевіч, сігналіст тав. Лапыш і іншыя.

Масава-растлумачальную работу сярод выбаршчыкаў яны цесна ўвязваюць з выкананнем сваіх абавязацельстваў па дастойнай сустрэчы XXIII гадавіны Кастрычніцкай Рэволюцыі, строга па графіку, без адзінай мінуты прастою, адпраўляюць паязды па назначэнню.

З ліку лепшай падрыхтаванай моладзі і комсамольцаў вылучана 30 агітатараў для правядзення растлумачальнай работы сярод сем'яў чыгуначнікаў. Некаторыя агітатары, як Кузмянкова, Федадзееў, Горкіна, Зайцаў, Лысенка, прыступілі ўжо да вывучэння з выбаршчыкамі Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі. Заняткі праходзяць арганізавана, цікава, з захапленнем. Агітатары дасканала рыхтуюцца да іх, падбіраюць мастацкую літаратуру, пераканаўчыя мясцовыя факты. Гэтым і тлумачыцца, што слухачы гурткоў самі ўдзельнічаюць у гутарках. На ўзнікаючыя пытанні агітатары даюць зразумелыя падрабязныя адказы. Асабліва цікавяць выбаршчыкаў пытанні аб совецкай выбарчай сістэме, хто мае права вылучаць кандыдатуры, на які тэрмін выбіраюцца мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Праводзячы агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў, агітатары агітуюць за перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, змагаюцца за тое, каб дзень выбараў азнаменаваць датэрміновым выкананнем вытворчых планаў, павелічэннем прадукцыйнасці працы і павышэннем якасці выпускаемай прадукцыі.

С. Партной.

Нарада старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў акруговых выбарчых камісій

27 кастрычніка ў тэатры «Палас» адбылася нарада старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў акруговых выбарчых камісій па выбарах у Беластоцкі горсовет.

Удзельнікі нарады заслухалі даклад старшыні горвыканкома тав. Ражноўскага аб задачах выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і задачах акруговых выбарчых камісій. Тав. Ражноўскі падрабязна спыніўся на поспехах, якіх дабіўся Беласток за перыяд існавання совецкай улады, а таксама ўказаў на задачы, які стаяць перад акруговымі выбарчымі камісіямі.

На нарадзе выступіў сакратар гарадскога камітэта КП(б)Б тав. Раманаў, які сваё выступленне прысвяціў ролі акруговых выбарчых камісій у разгортванні агітацыйнай работы і ўсямернаму павышэнню большэвіцкай пільнасці.

Чакаюць прадстаўніка з раёна

ШЧУЧЫН (Граеўскі раён). Прайшло ўжо 14 дзён, як пачалася выбарчая кампанія. У пасялковыя і сельскія советы штодзённа прыходзяць дзесяткі актывістаў, якія жадаюць уключыцца ў актыўную работу па выбарах у мясцовыя советы дэпутатаў працоўных. Яны жадаюць быць агітатарамі, прапагандыстамі, чытчыкамі, бяседчыкамі. Многія з іх правілі сябе ў час падрыхтоўкі і правядзення выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Не гледзячы на тэта, тут сярод выбаршчыкаў агітацыйна-масавая работа разгорнута нездавальняюча. Агітатары і прапагандысты не прыступілі да сваёй работы. У горадзе і вёсках няма ні аднаго гуртка па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і новага выбарчага закона.

Старшыня сельскага совета тав. Чарнецкі заяўляе: «Нашы агітатары не прыступілі да работы таму, што мы чакаем указанняў з раёна. Не прыязджае да нас і кіраўнік нашага агіткалектыва тав. Плаўнік. Каб ён прыехаў, мы назаўтра правялі-б нараду агітатараў і пачалі-б работу». Не прыязджаў у Шчучын і старшыня гарадской выбарчай камісіі тав. Чыжонак. І Плаўнік і Чыжонак з'яўляюцца работнікамі райкома партыі, але на месцы, дзе ад іх чакаюць дапамогі пакуль не выязджалі.

І. Гарбанёў.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

У чэсць Вялікага Кастрычніка

Стаханаўскія вахты на 2-м тэкстыльным камбінаце

З вялікім уздымам рыхтуецца сустрэць XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі калектыў 2-га камбіната. Тут шырока разгарнулася перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва.

У чэсць слаўнай гадавіны і выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных пасобныя цэхі і брыгады становяцца на стаханаўскую вахту.

24 кастрычніка на вахту стаў калектыў апаратна-прадзільнага цэха. Вынікі гэтага дня — выдатныя. Работніцы паказалі ўзоры высокапрадукцыйнай стаханаўскай работы. Вінтаўшчыца Шульц, якая працуе на сельфактары № 24, выканала заданне на 134,5 процанта. Вінтаўшчыца Гжыбко на сельфактары № 25 выканала норму на 119 процантаў. Добра працавалі апаратчыцы Асоўская і Бухалава.

26 кастрычніка на стаханаўскую вахту стаў адзін корпус ткацкага цэха.

* * *

26 кастрычніка з самай раніцы адчувалася вялікае ажыўленне. У гэты дзень 28 ткачоў-двухстаночнікаў сталі на стаханаўскую вахту. Ім своечасова была аказана неабходная дапамога. Гэтага стаханаўскай вахты выканалі ў сярэднім норму на 118 процантаў. Лепшых паказчыкаў дабіўся ткач-двухстаночнік Нетупскі. Ён даў за змену рэкордную выпрацоўку — 139,2 процанта і зарабіў за гэты дзень 39 рублёў. Стаханавец тав. Левітан выканаў дзённую норму на 131,3 процанта, зарабіўшы 36 рублёў. Ткач-стаханавец Берыла выканаў план на 129,7 процанта.

Высокапрадукцыйная стаханаўская работа дае добрыя рэзультаты. На 26 кастрычніка камбінат выпусціў 1.297 тысяч метраў гатовага тавару пры гадавым плане 1.340 тысяч метраў. Прыкметна палепшылася якасць выпускаемай прадукцыі. З 1 па 25 кастрычніка першага сорту выпушчана 92 процанты пры плане 86,7 процанта. Добрых вынікаў дабіўся таксама і калектыў апаратна-прадзільнага цэха, які з пачатку месяца даў 109,5 процанта, датэрмінова выканаўшы свой план.

Калектыў 2-га камбіната рыхтуе новыя вытворчыя падарункі да знамянальнай даты — 7 лістапада.

І. Уколаў, М. Фельдман.

Расце фабрыка і растуць людзі

Плюшавая фабрыка фірмы «Е. Бекер», якая праславілася сваёй шасцімесячнай забастоўкай у 1927 годзе, у апошнія годы белапольскага панавання паступова замірала. Яе прадукцыя няўхільна падала. Калі Чырвоная Армія ўвайшла ў Беласток, на фабрыцы працавалі толькі бухгалтар, два вартаўнікі і тры жанчыны на складзе гатовага тавару. Пуста і панура было ў шматлікіх фабрычных будынках. Усе цэхі бяздзейнічалі, машыны сталі.

Непазнавальна змянілася фабрыка з часу яе нацыяналізацыі. Апусцелая фабрыка пачала ажываць. Пад канец мінулага года на ёй ужо працавала 123 рабочых, у першым квартале 1940 года — 268, у другім квартале — 345, а ў трэцім — 394 чалавекі. Адпаведна ўзрасталі і выпуск гатовай прадукцыі. У чацвёртым квартале 1939 года ён складаў толькі 16.800 метраў, а ў трэцім квартале 1940 года — ужо 88 тысяч метраў.

Найбольш выдатным фактам з'яўляецца, безумоўна, рост людзей на нацыяналізаванай фабрыцы.

На фабрыцы каля 50 стаханаўцаў. Ткачы тт. Сеняк, Бароўская, Ленартоўскі, Казлоўская і іншыя выконваюць нормы на 120 — 150 процантаў. Маталыпчыца Юхніцкая і прысучальшчыца Трэтэр выконваюць нормы звыш чым на 150 процантаў. У аддзелачна-фарбавальным цэху выдатна працуюць т. т. Пятроўская, Герайкевіч, Савіцкі.

Лепшыя рабочыя і работніцы вылучаны на кіруючую работу. Так, напрыклад, рабочы Пятроўскі Вацлаў з'яўляецца зараз начальнікам фарбавальна-апрэтурнага цэха. Рабочыя Вігда Зігмунт і Гораха Грыгорый працуюць майстрамі ў фарбавальным і ткацкім цэхах. Казлоўскі В. вылучан на пасаду начальніка пажарнай аховы.

На фабрыцы працуюць гурткі па вывучэнню рускай мовы, арганізуецца драмгурток. Створаны чырвоны куток і фабрычная бібліятэка.

Усё гэта зроблена за адзін год.

Н. Гальперын, дырэктар беластоцкай плюшавай фабрыкі.

Прывітанне ад рабочых фабрыкі „Віль“

Працоўныя тэкстыльнай фабрыкі «Віль» з вялікай радасцю сустрэлі паведамленне аб вашых дасягненнях і поспехах на новай вызваленай зямлі. Мы вельмі шкадуем, што не змаглі прывітаць працоўных Беластока ў гадавіну вызвалення ад панскага ігу, але віна не наша, бо мы атрымалі ваш ліст з вялікім спазненнем. Вы прасілі нас расказаць аб сабе.

Работы многа. Павялічылі прадукцыйнасць працы. Умацоўваем працоўную дысцыпліну. Несупынна змагаемся з ворагамі народа. Днямі адкрылі дзіцячыя яслі, у хуткім часе адкрыем рабочы клуб. Але мы ўпэўнены, што ўсе цяжкасці, а іх упэрадзе яшчэ будзе многа, з часам пераможам. Працоўныя тэкстыльнай фабрыкі «Віль» гор. Нарва Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, нядаўна вызваленых ад ігу капіталістаў, заклікаюць сваіх братоў працоўных вызваленых абласцей Заходняй Беларусі сумесна з працоўнымі другіх Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік з яшчэ большай энергіяй прыняцца за павышэнне прадукцыйнасці працы, умацоўваючы тым самым магутнасць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы і дабрабыт усіх працоўных СССР.

Няхай жыве наша вялікая соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя (большэвікоў)!

Няхай жыве наш вялікі настаўнік, правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

Ад імені агульнага сходу рабочых тэкстыльнай фабрыкі «Віль» прывітанне падпісана групай рабочых.

ПАСТАНОВА БЕЛАСТОЦКАГА АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

Аб зацвярджэнні саставу раённых выбарчых камісій па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных

На падставе арт. арт. 35 і 36 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных БССР», Беластоцкі абласны выканаўчы камітэт **пастанаўляе:**

Зацвердзіць раённыя выбарчыя камісіі па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных у саставе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

АЎГУСТОЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ФІЛЬМАНОВІЧ Васілій Якаўлевіч—ад комуністычнай арганізацыі Аўгустоўскага раёна;

Намеснік старшыні — МАЦЭЯК Казіміра Іванаўна — ад грамадзян пасёлка імені Сталіна;

Сакратар — СЕРВЯНСКАЯ Ліза Натанаўна—ад комсамольскай арганізацыі Аўгустоўскага раёна.

Члены: РУДНІЦКІ Іосіф Міхайлавіч—ад сялян вёскі Чырвоны Бор;

СЕЛЬКОЎСКІ Станіслаў Іванавіч —ад калгаснікаў калгаса імені Сталіна;

ХУДАНЬКІН Нікандрый Грыгор'евіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў;

ЗАХАРАЎ Васілій Васільевіч — ад Асоавіяхіма;

САБАЛЕЎСКАЯ Марыя Спяпанаўна—ад профарганізацыі работнікаў паліТасветустаноў Аўгустоўскага раёна;

ФІЛЕЎСКІ Юзеф Лаўрэнц'евіч — ад калгаснікаў калгаса імені 17 верасня.

БЕЛЬСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — КРЫЖОЎ Кузьма Максімавіч—ад комуністычнай арганізацыі Бельскага раёна;

Намеснік старшыні — НАВІЦКАЯ Феаліцыя Владзіславаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

Сакратар—КРУМАК Юдэль Лейбавіч—ад комсамольскай арганізацыі Бельскага раёна.

Члены: ДРАБНОХ Марыя Міхайлаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

КОБАЗЕЎ Карнілій Аляксеевіч—ад Асоавіяхіма;

КАЗІМІРУК Сяргей Раманавіч — ад калгаснікаў калгаса імені Варашылава;

СІМАНЕНКА Іван Іванавіч — ад рабочых і служачых іразцовага завода.

БРАНСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—РУСАНАЎ Канстанцін Канстанцінавіч—ад комуністычнай арганізацыі Бранскага раёна;

Намеснік старшыні — КАЛЕШУК Антон Прохаравіч—ад профарганізацыі работнікаў сувязі раёна;

Сакратар — КАЗАКЕВІЧ Пётр Нікітыч—ад комсамольскай арганізацыі Бранскага раёна.

Члены: КАВАЛЬЧУК Пётр Францавіч—ад сялян вёскі Мень;

КУЛЬЧЫЦКАЯ Марыя Антонаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ;

ЗАБЛУДОЎСКАЯ Адэля Тэафілаўна—ад профарганізацыі работнікаў Медсанпрацы;

ВІШНЕЎСКІ Франц Іосіфавіч — ад грамадзян пасёлка Бранск;

БАБУЧА Рафаіл Герасімавіч—ад Асоавіяхіма;

ВОЛХАЎ Іван Сяргеевіч — ад Асоавіяхіма;

БЕЛАСТОЦКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — КЛЯНКОЎСКІ Іван Францавіч—ад комуністычнай арганізацыі Беластоцкага раёна;

Намеснік старшыні — КАЛОДКА Фёдар Бенедзіктавіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна;

Сакратар — ЕРМАЛОВІЧ Андрэй Міхеевіч—ад комсамольскай арганізацыі Беластоцкага раёна.

Члены: ВІЛЕНСКАЯ Элька Залманаўна—ад профарганізацыі паліТасветработнікаў Беластоцкага раёна;

РЭДУТА Юлія Антонаўна — ад сялян вёскі Бацюты;

ВРУБЛЕЎСКАЯ Ольга Іванаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

КОНА Вольф Сарсевіч—ад рабочых і служачых тэкстыльнага камбіната № 8 (Васількова).

ВАЎКАВЫСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ВЫГОДЗЕР Грыгорый Саламонавіч—ад комуністычнай арганізацыі Ваўкавыскага раёна;

Намеснік старшыні — ЗДАСЕВІЧ Вера Пятроўна—ад рабочых і служачых мясакамбіната;

Сакратар—ЧЫСТОВА Вера Аляксандраўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна.

Члены: РЫБАЛКА Елена Казіміраўна—ад профарганізацыі работнікаў Медсанпрацы раёна;

ЛІДЗЕВІЧ Ірына Андрэеўна — ад калектыва настаўнікаў г. Ваўкавыска;

МАЛЬЦАЎ Павел Георгіевіч—ад Асоавіяхіма;

ОСМАЛОВІЧ Іван Міхайлавіч—ад грамадзян мястэчка Ізабеліна;

САРОКА Сямён Канстанцінавіч—ад рабочых і служачых цэментнага завода «Рось».

КАНСТАНЦІНОВІЧ Якаў Андрэевіч—ад рабочых і служачых цэментнага завода «Рось».

ГРАЕЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ТАРАСЕВІЧ Спірыдон Ільіч—ад комуністычнай арганізацыі Граеўскага раёна;

Намеснік старшыні—СКАНЕЦКІ Чэслаў Эдмундавіч—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

Сакратар — КОБАТАВА Любоў Паўлаўна—ад настаўнікаў г. Граева.

Члены: СІЗЕМСКАЯ Валенціна Аляксандраўна—ад рабочых і служачых чыгункі станцыі Граева;

МАРКУСФЕЛЬД Есель Ісакавіч—ад работнікаў гарадской кааператыўнай арганізацыі;

МАХІН Владзіслаў Владзіслававіч— ад працоўных г. Граева;

САБАЛЕЎСКІ Іван Францавіч — ад калектыва работнікаў райвыканкома.

ГРОДНЕНСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — КАМАРОЎ Ілья Якаўлевіч—ад комуністычнай арганізацыі Гродненскага раёна;

Намеснік старшыні—ЖВАЛЕЎСКІ Грыгорый Ігнац'евіч—ад рабочых і служачых МТС;

Сакратар—РАГАВАЯ Анна Васільеўна—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна.

Члены: ЖУКОЎСКІ Нікалай Аляксеевіч — ад калгаснікаў калгаса «Шлях комунізма»;

САЛАВЕЙ Іван Нікіфаравіч — ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

ЛАДНОЎ Анатолій Майсеевіч—ад Асоавіяхіма;

РАБІНОВІЧ Аляксандр Майсеевіч—ад профарганізацыі работнікаў Медсанпрацы;

ШУСЦІНСКІ Андрэй Васільевіч—ад Асоавіяхіма;

ЖУКОЎСКІ Спяпан Аляксеевіч—ад рабочых і служачых соўгаса «Свіслач».

ДАМБРАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—СТАШКЕВІЧ Станіслаў Паўлавіч — ад комуністычнай арганізацыі Дамбраўскага раёна;

Намеснік старшыні—СЕДЗІК Станіслава Іванаўна—ад сялян вёскі Мальшава;

Сакратар — ЗАБЕРМАХ Нікалай Васільевіч—ад комсамольскай арганізацыі Дамбраўскага раёна.

Члены: ДРОНАВА Марыя Нікалаеўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

САМАЛЕВІЧ Станіслаў Іванавіч—ад інтэлігенцыі Дамбраўскага раёна;

ЯСЮКЕВІЧ Вацлаў Адамавіч — ад сялян вёскі Ясінаўка;

КРЫЎДА Аляксандр Пятровіч — ад Асоавіяхіма;

ЕДВАБНАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—УСЦІЛОЎСКІ Дзмітрый Барысавіч—ад комуністычнай арганізацыі Едвабнаўскага раёна;

Намеснік старшыні—КРЭСТОЎЧЫК Чэслаў Іванавіч—ад калектыва работнікаў Едвабнаўскага райвыканкома;

Сакратар—РУБЕЖ Міхаіл Пятровіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў Едвабнаўскага раёна;

Члены: АНІШЧАНКА Кірыл Грыгор'евіч—ад Асоавіяхіма;

ГРЫЦЭНКА Фёдар Сямёнавіч — ад Асоавіяхіма;

НОРМАН Іосіф Браніслававіч — ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Едвабнаўскага раёна;

БЖОЗА Ніна Мееравўна—ад калектыва работнікаў аддзялення сувязі;

БАНДАРЭНКА Надзежда Ефімаўна—ад профарганізацыі паліТасветработнікаў Едвабнаўскага раёна;

КАЛІНОЎСКІ Іосіф Іванавіч — ад сялян вёскі Сестшанкі.

ЗАМБРАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ШЭРШЭНЬ Чэслаў Якаўлевіч—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Замбраўскага раёна;

Намеснік старшыні — ЛІПСКІ Владзімір Аляксандравіч—ад комуністычнай арганізацыі Замбраўскага раёна;

Сакратар—БРЭНІГ-АЛЬТБАХАВА Гольда Асясаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна.

Члены: КОЛАС Елена Фёдараўна—ад комсамольскай арганізацыі Замбраўскага раёна;

МАЗАЛЕЎСКАЯ Ольга Кірылаўна—ад сялян вёскі Воля Замбраўская;

ВЕРДНІКАЎ Леў Абрамавіч—ад профарганізацыі будаўнічых рабочых раёна;

КРЭСІК Іван Канстанцінавіч—ад раённай арганізацыі Асоавіяхіма Замбраўскага раёна;

СТУПНІК Майсей Шлёмавіч—ад калектыва рабочых і служачых арцелі імені Карла Маркса;

САМУСІК Анастасія Андрэеўна—ад профарганізацыі работнікаў Медсанпрацы Замбраўскага раёна.

ЗАБЛУДАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ІВАНЕЦ Цімафей Іванавіч—ад комуністычнай арганізацыі Заблудаўскага раёна;

Намеснік старшыні—ШЭЙНОГА Нікалай Якаўлевіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў Заблудаўскага раёна;

Сакратар — НЯНЕНКОЎ Максім Ільіч—ад комсамольскай арганізацыі Заблудаўскага раёна.

Члены: ОЗЯБЛА Іван Ігнац'евіч—ад профарганізацыі фінбанкаўскіх работнікаў раёна;

РАЧКОЎСКАЯ Дзіна Маркаўна — ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

ЗАГАДЖАН Мар'ян Вікенц'евіч—ад калектыва работнікаў райвыканкома;

ОЖЭХОЎСКАЯ Вера Іванаўна—ад профарганізацыі паліТасветработнікаў раёна.

КНЫШЫНСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ШВЕДАЎ Іван Антонавіч—ад комуністычнай арганізацыі Кнышынскага раёна;

Намеснік старшыні—КАХАНСКАЯ Юзэфа Антонаўна—ад комсамольскай арганізацыі Кнышынскага раёна;

Сакратар — БРЖЭСКІ Казімір Міхайлавіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна.

Члены: ХОМЧЭНКАЎ Міхаіл Іванавіч—ад Асоавіяхіма;

БАРЫСЕНКА Тац'яна Федараўна — ад грамадскай арганізацыі Асоавіяхіма Кнышынскага раёна;

БЕЙЛАХ Сроль Шмуілавіч — ад рабочых і служачых скуразавода № 8;

КАБЕШКА Зофія Антонаўна—ад калгаснікаў калгаса імені 1-га Мая.

КРЫНКАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ЭЦІН Самуіл Майсеевіч—ад комуністычнай арганізацыі Крынкаўскага раёна;

Намеснік старшыні — КАРПЮК Анна Іванаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

Сакратар—ЗОРЫНА Анна Канстанцінаўна — ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна;

Члены: МЕНАСЯН Мінас Арцюнавіч—ад Асоавіяхіма;

ШЫПОЎ Фёдар Кандрац'евіч — ад раённай арганізацыі МОПР'а;

КІШКЕЛЬ Юльян Аляксеевіч — ад сялян гарадскога пасёлка Крынкі;

ШУТКЕВІЧ Еўгенія Андрэеўна—ад калектыва рабочых і служачых скуранай арцелі «Ленінскі шлях».

КОЛЬНАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ВЕРЛІН Арон Мендэлевіч—ад комуністычнай арганізацыі Кольнаўскага раёна;

Намеснік старшыні—УЛІШЭЎСКІ Владзіслаў Рамуальдавіч—ад грамадзян мястэчка Кольна;

Сакратар—ШЫЦІК Ірына Міхайлаўна—ад профарганізацыі паліТасветработнікаў раёна.

Члены: ЗЯЛЁНКА Лейба Шоламавіч—ад Асоавіяхіма;

КУЛІНГОЎСКІ Франц Луцыянавіч—ад сялян мястэчка Кольна;

РУСЕЦКАЯ Станіслава Іосіфаўна—ад профарганізацыі МТС;

КУЛЕНГОЎСКАЯ Яніна Міхайлаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна.

ЛАПСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — НЯМІРА Вітольд Іосіфавіч — ад комуністычнай арганізацыі Лапскага раёна.

Намеснік старшыні — ІЧКОЎСКІ Войцэх Грыгор'евіч—ад сялян вёскі Каўшчызна;

Сакратар—ГІРДЗЮК Барыс Іванавіч — ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў.

Члены: БАНАС-БАНАСЮК Адольф Станіслававіч — ад сялян вёскі Лапы-Дэмбавізна;

ПАУКШТ Леон Адамавіч — ад рабочых і служачых паравозавагонарамонтнага завода;

ПАЛУХІН Сяргей Паўлавіч — ад Асоавіяхіма;

КАВАЛЕЎСКАЯ Станіслава Станіславаўна—ад калгаснікаў калгаса імені 8-га сакавіка.

ЛОМЖЫНСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—СКЛЯРАЎ Іван Владзіміравіч—ад комуністычнай арганізацыі Ломжынскага раёна;

Намеснік старшыні—КУРЧЭЎСКІ Антон Іосіфавіч—ад сялян вёскі Купіскі;

Сакратар—НІКАЛАЕВА Клаўдзія Нікалаеўна—ад калектыва работнікаў райана.

Члены: РУДКОЎСКІ Чэслаў Войцэхавіч—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

ДАЦЭНКА Васілій Міхайлавіч — ад Асоавіяхіма;

ЗАБЕЛЬСКІ Мар'ян Францавіч—ад рабочых і служачых шўнога завода Драздова;

ЛЕЎ Шлёма Аронавіч—ад рабочых і служачых МТС.

ПАРЭЦКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ЧЭРНУХА Васілій Васільевіч—ад комуністычнай арганізацыі раёна;

Намеснік старшыні—ІЛЬКЕВІЧ Іосіф Казіміравіч—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоны спят»;

Сакратар — МІРАНЮК Андрэй Андрэевіч—ад профарганізацыі пачатковых і сярэдніх школ раёна.

Члены: Паўлюкевіч Іосіф Іосіфавіч—ад комсамольскай арганізацыі раёна;

БАЖЭНКА Анна Пятроўна — ад калектыва фінбанкаўскіх работнікаў раёна;

КІЗЕВІЧ Вера Іванаўна—ад кааператыўнай арганізацыі раёна;

ДУДЗЕЛЬ Іван Спірыдонавіч—ад профарганізацыі чыгуначнікаў станцыі Парэчча;

ХАРКЕВІЧ Зінаіда Макараўна—ад калектыва работнікаў райвыканкома.

СВЁКЛА Юзэфа Пятроўна—ад сялян вёскі Ліхачы.

СВІСЛАЦКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—КАРОЛЬ Спяпан Спяпанавіч—ад комуністычнай арганізацыі Свіслацкага раёна;

Намеснік старшыні — ВАЙНЕР Пейсах Іоселевіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна;

Сакратар—РАМАНЕНКА Надзежда Міхайлаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна.

Члены: ГЕРМАН Антон Герасімавіч — ад калгаснікаў калгаса «Ленінскі шлях»;

ГРЫЦЭНКА Сямён Ягоравіч — ад Асоавіяхіма;

КАРДАШ Любоў Пятроўна — ад комсамольскай арганізацыі Свіслацкага раёна;

САЛАГУБІК Анастасія Якаўлеўна— ад рабочых і служачых скурзавода № 11;

РАБІК Меер Іосіфавіч — ад калгаснікаў калгаса «1-е мая».

БАРОНКА Клименцій Міхайлавіч—ад сялян вёскі В. Грынкі.

САКОЛКАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ГАРФІНКЕЛЬ Меер Лейбавіч—ад комуністычнай арганізацыі Саколкаўскага раёна;

Намеснік старшыні—ГАЛЬЧЭНЯ Герасім Маркавіч—ад профарганізацыі работнікаў дзяржустаноў раёна;

Сакратар—ЛЕБЕДЗЕЎ Павел Аляксандравіч—ад профарганізацыі фінбанкаўскіх работнікаў раёна.

Члены: СПЕКТАР Ісак Аронавіч—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

ШАЛКЕВІЧ Владзімір Іванавіч—ад сялян вёскі Суковічы;

СУРАВЕЦ Вера Іванаўна — ад калгаснікаў калгаса імені Сталіна;

СУРГАНАЎ Аляксандр Паўлавіч—ад Асоавіяхіма;

САПОЦКІНСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ПАЎЛАЎ Аляксей Акімавіч—ад комуністычнай арганізацыі раёна;

Намеснік старшыні — МАРТЫШ Аляксандр Юравіч—ад сялян мястэчка Сапоцкіна;

Сакратар — КАЗЛОВА Тамара Іванаўна—ад комсамольскай арганізацыі раёна.

Члены: ГАБРУКЕВІЧ Зігмунд Юльянавіч—ад калгаснікаў калгаса імені 22 верасня;

РЭДЭР Ядвіга Іванаўна—ад профарганізацыі фінбанкаўскіх работнікаў раёна;

ЦЮКІН Кузьма Васільевіч — ад Асоавіяхіма;

НОСІК Пётр Мартынавіч — ад калгаснікаў калгаса «Ударнік».

СКІДЗЕЛЬСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—ВАРГАНАЎ Мітрафан Лаўрэнц'евіч—ад калектыва работнікаў райвыканкома;

Намеснік старшыні—ЛАГУЦЁНАК Якаў Кузьміч—ад кааператыўнай арганізацыі раёна;

Сакратар—ВАСІЛЕЎСКАЯ Міхаліна Вацлаваўна—ад профарганізацыі дзяржустаноў раёна.

Члены: ЭПШТЭЙН Сара Юдалеўна—ад рабочых і служачых Скідзельскага скурзавода;

МАКАРЧУК Сяргей Іванавіч—ад рабочых і служачых соўгаса «Скідзэль»;

ШАГУН Марыя Матвееўна—ад калгаснікаў калгаса імені Варашылава;

МАКАРЭВІЧ Леонцій Максімавіч—ад профарганізацыі работнікаў Медсанпрацы раёна.

СНЯДАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня—НІКІЦЕНКА Іван Савельевіч—ад комуністычнай арганізацыі раёна;

Намеснік старшыні—ПЯРКУЎНА Ізабела Пятроўна—ад профарганізацыі пачатковых і сярэдніх школ раёна;

Сакратар — ШЧЭРБАКОЎ Іван Паўлавіч — ад профарганізацыі дзяржустаноў раёна.

Члены: КУРБАТАЎ Сяргей Іосіфавіч—ад Асоавіяхіма;

ГАЛАШЭЎСКІ Іосіф Канстанцінавіч—ад агульнага схода калгаснікаў калгаса «Чырвоны пагранічнік»;

ЛЕШЧЫНСКАЯ Софія Станіславаўна — ад калгаснікаў калгаса «Сталінец»;

ДЫБНЕР Марыя Шмуйлаўна — ад профарганізацыі фінбанкаўскіх работнікаў раёна;

КАЛБАНАЎ Фёдар Еўсеевіч—ад комсамольскай арганізацыі раёна.

ЦЭХАНАВЕЦКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ГАМУЛЬСКІ Пётр Спяпанавіч—ад комуністычнай арганізацыі Цэханавецкага раёна;

Намеснік старшыні—СТЭЧ Ірына Іосіфаўна—ад комсамольскай арганізацыі раёна;

Сакратар—ПАДНОС Майсей Мендэлевіч — ад арганізацыі Асоавіяхіма раёна.

Члены: МІРКОВІЧ Аляксандр Іосіфавіч — ад сялян вёскі Тварковіца;

МІНЬКОВІЧ Рахіль Куселеўна — ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ раёна;

ЯНКОЎСКАЯ Анна Станіславаўна—ад сялян вёскі Вайтковіцы;

МУРАЎКА Павел Антонавіч—ад сялян вёскі Бялы-Мшытале.

ЧЫЖАЎСКАЯ РАЁННАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

Старшыня — ЛІНКЕВІЧ Еўгеній Міхайлавіч — ад профарганізацыі работнікаў МТС;

Намеснік старшыні — ГУРЫН Кузьма Ягоравіч—ад комуністычнай арганізацыі Чыжаўскага раёна;

Сакратар—КЛЯР Якаў Іосіфавіч—ад профарганізацыі паліТасветработнікаў раёна.

Члены: ВАЙТКОЎСКІ Аляксандр Станіслававіч — ад грамадзян пасёлка Чыжага;

БЕНІНСОН Ісак Майсеевіч — ад Асоавіяхіма;

САДОЎСКАЯ Яніна Іванаўна — ад сялян вёскі Дамбрава;

ШАНДАРСКАЯ Владзіслава Іванаўна—ад калгаснікаў калгаса імені Варашылава.

Старшыня Абласнога Выканаўчага Камітэта **С. МАЛЬЦАЎ.**

Сакратар Абласнога Выканаўчага Камітэта **П. ЗУБОВІЧ**

Людзі, якім аказана высокае давер'е

Іх трынаццаць. Яны — члены гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных. Працоўныя горада даверылі ім арганізаваць выбары дэпутатаў, якія-б, не шкадуючы сваіх сіл, працавалі на дабро народа, штодзённа клапаціліся аб працвітанні Беластока, няспынна працавалі над далейшым развіццём прамысловасці, сеткі школ, бальніц, клубаў, дзіцячых садоў і ясляў, над упарадкаваннем абласнога цэнтра заходняга фарпоста Совецкай краіны.

Хто-ж гэтыя людзі, якім аказана такое высокае давер'е народа?

У камісію выдзелены людзі розных прафесій, нацыянальнасцей і ўзросту. Тут мы знойдзем і Канстанціна Георгіевіча Кучэўскага, ураджэнца в. Шацілы, што ў 12 кіламетрах ад Беластока, і стаханаўку-матальшчыцу 2-га тэкстыльнага камбіната, актыўнага страхдэлегата Марыю Аляксандраўну Давідзюк. У камісіі працуе і інспектар дзяржгандлю Мельнікаў, і артыст польскага тэатра Марыян-Яцэк Войцэхавіч Вашчэровіч, і комсамолка Рахіль Беркаўна Беластоцкая, і 58 галовы рабочы Аляксандр Спяпанавіч Краўчук, які ўжо 42 гады прапрацаваў стрэлачнікам на Беластоцкім чыгуначным вузле. Працоўныя вылучылі ў камісію чырвонаармейца Анатолія Цімафеевіча Фастоўскага і сукнавальшчыка 6-га камбіната Пятра Іванавіча Сакольскага. Розныя спецыяльнасці, нацыянальнасць і ўзрост членаў камісіі, але ўсіх іх аб'ядноўвае адно — адданасць справе партыі Леніна—Сталіна, гатоўнасць ад усяго сэрца працаваць на дабро працоўных, бо ўсе гэтыя людзі — сыны і дочкі працоўнага народа.

Старшыня камісіі тав. Кучэўскі паходзіць з бядняцкай сялянскай сям'і в. Шацілы, былога Беластоцкага павета. Тут Косця Кучэўскі правёў і сваё дзяцінства. У час імперыялістычнай вайны на сялянскіх падводах родныя вывезлі Кучэўскага ва ўсходнія губерні Расіі. Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі ён уступае ў Чырвоную Армію, якая выхавала яго, як совецкага грамадзяніна, большэвіка. Рад гадоў прабыў тав. Кучэўскі на адказнай партыйнай рабоце, а калі Чырвоная Армія вызваліла працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, яго накіравалі ў Беласток. Пабываўшы ў родных месцах, тав. Кучэўскі не пазнаў сваёй вёскі. Польскія правіцелі раздрабнілі яе на хутары, асудзілі насельніцтва на маруднае вымiранне. І толькі першы год сяляне ўздыхнулі вольна, прыступіўшы да будаўніцтва новага жыцця. У гэтым будаўніцтве велізарную ролю павінны адыграць дэпутаты мясцовых Советаў, за арганізацыю выбараў якіх энергічна ўзяўся старшыня гарадской камісіі.

Намеснік старшыні гарадской камісіі Марцэль Матвеевіч Навотка ў 1918 годзе ўступіў у комуністычную партыю Польшчы. Працуючы сакратаром акруговага камітэта, трапіў у турму. Звярнуўшыся на волю, тав. Навотка зноў працуе сакратаром акруговага камітэта. У 1935 годзе польскі суд прыгаварвае яго да 12 год пазбаўлення волі, але Навотка не сумаваў. Ён цвёрда верыць у правату справы комуністычнай партыі. і ў дні польска-германскай вайны разам з таварышамі ламае жалезныя краты і ідзе насустрач роднай Чырвонай Арміі.

Бацька Стэфаніды Васільеўны Жыўлюк, вылучанай у гарадскую камісію калектывам рабочых 1-га камбіната, пасвіў жывёлу ў в. Едзічы, Крынкаўскага павета. Вясковае беззямелле, голад, жабрацтва прымусілі Стэфаніду пайсці ў Беласток у прыслугі да багатага адваката. У 1930 годзе ёй удаецца трапіць на фабрыку, дзе яе сустрэла цяжкае становішча тэкстыльшчыцы-сезонніцы.

Совецкая ўлада дала сям'і Жыўлюк 8 гектараў зямлі, карову, хату, а Стэфанідзе — пачотнае добрае званне стаханаўкі. Услед за дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР тав. Пятроўскай Жыўлюк адна з першых перайшла на ўшчыльненую работу з пяцісот на тысячу верацён. І тут Жыўлюк паказала ўзоры працы. Яе брыгада замест 141 кілограма пражы па норме штодзённа выдае 177—190 кілаграмаў. Знатнага брыгадзіра-вінтаўшчыцу рабочыя выбралі старшынёй цэхавага камітэта, членам культурнай і рэвізійнай камісій фабкома, нарэшце, намеснікам народнага суддзі.

Урача Владзіміра Якаўлевіча Бомаша, як і іншых членаў камісіі, ведае ўвесь рабочы Беласток. У «касе хворых» ён пастаянна ваяваў за паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання рабочых. Тав. Бомаш зараз працуе ў лепшай паліклініцы горада. Упершыню за сваю 24-гадовую практыку Владзімір Якаўлевіч атрымаў магчымасць працаваць з поўным задавальненнем, адчуваючы штодзённыя клопаты аб ахове здароўя працоўных з боку партыйных і совецкіх арганізацый.

У камісію выбрана польская народная настаўніца Ірына Маркелеўна Жалендоўская. Яна — дачка чыгуначніка — ужо 19 год выкладае ў пачатковых школах польскую, нямецкую і рускую мовы. Аднак толькі другі навучальны год Ірына Маркелеўна перажывае радасць працы.

— У панскай Польшчы тысячы дзяцей не вучыліся,—расказвае тав. Жалендоўская,—і гэта мала непакоіла правіцеляў. — Цяпер мы самі, педагогі, абыходзім кватэры навучаючыхся і высвятляем прычыны, якія перашкаджаюць наведванню школы. У пачатку навучальнага года мы прыцягнулі такім чынам да заняткаў каля 30 навучаючыхся. Праграмы сталі глыбокімі і змястоўнымі. Уведзены новыя прадметы. Так, у 5 і 6 класах паявілася выкладанне замежных моў, старажытнай гісторыі.

Народ даверыў арганізацыю выбараў дэпутатаў у мясцовыя Советы лепшым сваім прадстаўнікам.

В. Арэф'еў.

ГУТАРКА З ЧЫТАЧОМ

Аб рабоце В. І. Леніна „Чарговыя задачы Совецкай улады"

К вясне 1918 года маладая совецкая рэспубліка атрымала рад буйнейшых перамог. Улада буржуазіі была скінута, гаспадарчая яе магутнасць — зломлена. У рукі пролетарскай дзяржавы перайшлі камандныя вышыні народнай гаспадаркі (фабрыкі, заводы, банкі, чыгункі, знешні гандаль і т. п.). Першыя спробы ўзброеных выступленняў контррэволюцыі супроць совецкай улады ўнутры краіны скончыліся паражэннем. Паднятым юнкерамі контррэволюцыйны мяцеж у Петраградзе 10 лістапада 1917 года на другі-ж дзень быў ліквідаван матросамі і чырвонагвардзейцамі. 13 лістапада ля Пулкаўскіх вышынь быў разгромлен генерал Красноў, які наступаў на Петраград. Разгрому падверглася таксама контррэволюцыйная Стаўка на чале з генералам Духоніным. К канцу студзеня 1918 года чырвонагвардзейскімі атрадамі былі разбіты банды генерала Каледзіна і Аляксеева, пачаўшыя барацьбу супроць совецкай улады на Дану яшчэ ў лістападзе 1917 года. У красавіку 1918 года былі разгромлены банды пераемніка Каледзіна — генерала Багаеўскага, і сам ён быў расстралян.

3 сакавіка 1918 года быў заключан мір з Германіяй. Мір гэты, не глядзячы на цяжкія ўмовы яго, даў совецкай краіне перадышку, даў магчымасць сканцэнтраваць усе сілы на найбольш цяжкай і адказнай задачы социялістычнай рэволюцыі, задачы арганізацыйнай. Атрыманне гэтай, хоць і кароткачасовай, перадышкі неабходна было скарыстаць для разгортвання социялістычнага будаўніцтва. Перад краінай, разбуранай імперыялістычнай вайной, сталі задачы аднаўлення народнай гаспадаркі, эканамічнага ўздыму краіны сур'ёзнага павышэння яе абароназдольнасці, сталі задачы стварэння новых социялістычных вытворчых адносін. Гэтым пытанням і была прысвечана вядомая работа Владзіміра Ільіча Леніна — «Чарговыя задачы Совецкай улады», напісаная ім у сакавіку — красавіку 1918 года.

Раскрываючы задачы, стаяўшыя перад партыяй большэвікоў на розных этапах яе барацьбы за перамогу социялістычнай рэволюцыі, Ленін указваў: першай задачай, стаяўшай перад партыяй, было перакананне рабочага класа, перакананне большасці працоўных у правільнасці праграмы і тактыкі партыі. Гэтую задачу, якая высоўвалася на першы план пры царызме і ў перыяд лютаўскай рэволюцыі да кастрычніка 1917 года, большэвікі ў асноўным выканалі; рабочы клас і кіруемае ім беднейшае сялянства пераканаліся ў правільнасці праграмы і тактыкі большэвіцкай партыі і пайшлі за ёй. Другой задачай было заваяванне палітычнай улады і падаўленне эксплаататараў, і гэтая задача ў асноўным была выканана. Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя змяла панаванне буржуазіі — да ўлады прышоў новы клас — пролетарыят. На чаргу высоўвалася новая асноўная задача — задача арганізацыі кіравання краінай.


«Мы, партыя большэвікоў, Расію пераканалі. Мы Расію адваявалі — у багатых для бедных, у эксплаататараў для працоўных. Мы павінны цяпер Расіяй кіраваць». І далей «Трэба прадумаць, што для паспяховага кіравання неабходна, апрача ўмення пераканаць, апрача ўмення перамагаць у грамадзянскай вайне, уменне практычна арганізаваць. Гэта—самая цяжкая задача, бо справа ідзе аб арганізацыі па новаму самых глыбокіх, эканамічных асноў жыцця дзесяткаў і дзесяткаў мільёнаў людзей. І гэта — самая ўдзячная задача, бо толькі пасля яе вырашэння (у галоўных і асноўных рысах) можна будзе сказаць, што Расія стала не толькі совецкай, але і социялістычнай рэспублікай» (Ленін, т. XXII, стар. 441—442).

Асноўнай умовай паспяховага вырашэння стаяўшай перад партыяй і рабочым класам арганізацыйнай задачы Владзімір Ільіч Ленін лічыў — поўнае ўсваенне карэннай розніцы паміж буржуазнымі рэволюцыямі ў мінулым і социялістычнымі рэволюцыямі. Гэтае адрозненне заключалася ў тым, што на долю працоўных мас у буржуазных рэволюцыях прыходзілася, галоўным чынам, работа па знішчэнню феадалізма, манархіі і ўсіх астаткаў сярэдневякоўя, работу-ж па арганізацыі новага грамадства выконвала буржуазія. Галоўнай задачай пролетарыята і кіруемага ім беднейшага сялянства ва ўсякай социялістычнай рэволюцыі, а значыць і ў нашай Кастрычніцкай рэволюцыі, з'яўляецца творчая работа — работа па стварэнню новых социялістычных вытворчых адносін, стварэнне новай социялістычнай эканомікі.

Владзімір Ільіч падкрэсліў, што гэтая задача рэволюцыі «можа быць паспяхова ажыццёўлена толькі пры самастойнай гістарычнай творчасці большасці насельніцтва, перш за ўсё большасці працоўных» (Ленін, т. XXII, стар. 440).

Усенародны ўчот і кантроль быў неабходнай умовай як для аднаўлення народнай гаспадаркі, так і для пераадолення арганізацыйных цяжкасцей першых крокаў да социялізма. Але значэнне ўчота і кантроля гэтым не вычэрпвалася. Найвялікшае сусветна-гістарычнае значэнне барацьбы за ўсенародны ўчот і кантроль Ленін бачыў у тым, што гэта была барацьба за пераадоленне старых адносін мас да дзяржавы, велізарная працяглая барацьба за выхаванне ў працоўных новых адносін да совецкай социялістычнай дзяржавы, да грамадскай социялістычнай уласнасці.

Людзі стагоддзямі прывучаліся глядзець на здабыванне матэрыяльных багаццяў, як на прыватную справу, як на здзелку. Барацьба за



В. І. Ленін за чытаннем «Праўды» у сябе ў кабінеце ў Крэмлі (Масква, кастрычнік 1918 г.).

Фота-клішэ ТАСС.

ўнядрэнне ў масы совецкага кантроля і ўчота была барацьбой социялістычнай свядомасці супроць буржуазна-анархічнай стыхіі. Бесспразадзачнасць і бескантрольнасць у справе вытворчасці і размеркавання прывяла-б да гібелі социялістычнай рэволюцыі і рэстаўрацыі панавання буржуазіі.

Задача пераадолення ў працоўных нянавісці і недавер'я да дзяржавы, выхавання ў іх новых адносін да дзяржавы, да яе інтарэсаў, да дзяржаўнай грамадскай маёмасці Ленін лічыў важнейшай, неабходнай умовай паспяховага будаўніцтва комуністычнага грамадства. Гэтая задача вырашалася і паспяхова вырашаецца партыяй на ўсіх этапах социялістычнага будаўніцтва. Найбольш яркім выражэннем нашых поспехаў у гэтай галіне з'яўляецца стаханаўскі рух. Мільёны стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі — гэта людзі, якія адносяцца да сваёй працы, да ўсёй сваёй вытворчай і грамадскай работы з пункту погляду дзяржаўных інтарэсаў, гэта дзяржаўныя дзеячы, для якіх інтарэсы вытворчасці, інтарэсы народа, інтарэсы комунізма стаяць на першым плане. Аднак у нас яшчэ захаваліся сярод адсталай часткі працоўных старыя адносіны да дзяржавы. Антыдзяржаўныя, а значыцца і антынародныя тэндэнцыі яшчэ знаходзяць сабе месца ў адсталай частцы рабочых і служачых, у пэўнай частцы калгаснікаў. Гэтыя адносіны выражаюцца ў самых разнастайных формах: у неахайных адносінах да сродкаў вытворчасці, у растранжыраванні дзяржаўных сродкаў, у выпуску нядобраякаснай прадукцыі, у рвацтве, лятунстве, нядобрасумленных адносін некаторых калгасаў і калгаснікаў да выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, у нежаданні выконваць дзяржаўныя планы і заданні і т. д. і т. п. Вось чаму гэтая задача—задача выхавання новых адносін да совецкай социялістычнай дзяржавы, — пастаўленая Леніным 22 гады таму назад, захавала сваё велізарнае гістарычнае і практычнае значэнне і да сённяшняга дня.

Для паспяховага развіцця социялізма Ленін лічыў неабходным прыцягнуць да работы буржуазных специялістаў, не лічачыся з тым, што іх прышлося-б больш высока аплачваць. Гэтая часовая мера тым быстрэй магла-б быць адменена, чым быстрэй быў-бы наладжан социялістычны ўчот і кантроль — з аднаго боку, і авалоданне рабочым класам тэхнічнымі і арганізацыйнымі навыкамі — з другога боку.

У цеснай сувязі з устанаўленнем найстражэйшага ўсенароднага кантроля і ўчота, Ленін ставіў пытанне аб павышэнні прадукцыйнасці працы. Ён пісаў:

«Ва ўсякай социялістычнай рэволюцыі, пасля таго як вырашана задача заваявання ўлады пролетарыятам і па меры таго, як вырашаецца ў галоўным і асноўным задача: — экспрапрыіраваць экспрапрыятараў, высоўваецца неабходна на першы план карэнная задача стварэння вышэйшага, чым капіталізм, грамадскага ўкладу, іменна: павышэнне прадукцыйнасці працы, а ў сувязі з гэтым (і для гэтага) яго вышэйшая арганізацыя» (там-жа, стар. 453).

Уздым прадукцыйнасці працы ёсць працэс працяглы, і яго працяглаcць вызначаецца аб'ектыўнымі ўмовамі. Першае — ён патрабуе забеспячэння матэрыяльнай асновы буйнай індустрыі: развіцця вытворчасці паліва, жалеза, машынабудаўніцтва і т. д. Совецкая рэспубліка, як указваў Владзімір Ільіч Ленін, валодала дастатковымі запасамі руды, каменнага вугалю, нафты, хімсыравіны, лясамі і воднай энергіяй. Адпаведная распрацоўка гэтых натуральных багаццяў давала аснову каласальнаму росту прадукцыйных сіл.

Другой умовай, без якой немысліма значнае павышэнне прадукцыйнасці працы, з'яўляўся культурны ўзровень працоўных, уздым якога бурна пачаўся пасля перамогі над буржуазіяй. Нарэшце, неабходна павышэнне дысцыпліны працоўных.

У шырокіх масах вызваленага народа пачаўся пераход да новай працоўнай дысцыпліны, выпрацоўка новых социялістычных адносін да працы. Але гэты працэс ішоў марудна, і гэта было немінуча таму, што працоўныя стагоддзямі вымушаны былі працаваць на эксплаататараў, стагоддзямі ў народа складаліся адносіны да працы, як да паднявольнага абавязку, які звязан з гнётам, эксплаатацыяй, патарджэннем чалавечага дастоінства. Іншых адносін да працы, іншых асноў працоўнай дысцыпліны да поўнай перамогі над буржуазіяй і памешчыкамі ў рабочых і сялян не магло быць. Ленін, падкрэсліваючы задачы партыі па выхаванню ў рабочым класе социялістычных адносін да працы, падкрэсліваючы значэнне барацьбы з дробнабуржуазнай анархіяй і недысцыплінаванасцю, пісаў:

«... Поспех социялізма немыслім без перамогі пролетарскай свядомай дысцыплінаванасці над стыхійнай дробнабуржуазнай анархіяй, гэтага сапраўднага залога магчымай рэстаўрацыі керэншчыны і карнілаўшчыны» (там-жа, стар. 454).

Найбольш свядомая частка рускага рабочага класа ўжо ставіла сваёй задачай павышэнне працоўнай дысцыпліны (Палажэнне аб працоўнай дысцыпліне, прынятае Усерасійскім Советам Прафесіянальных саюзаў).

Гэтае імкненне перадавых рабочых трэба было, як указваў Ленін, усямерна падтрымліваць, папулярызаваць узоры павышэння працоўнай дысцыпліны і прадукцыйнасці працы. Ленін прапанаваў практычна прымяніць і выпрабаваць здзельную аплату, скарыстаць усё навуковае і прагрэсіўнае ў арганізацыі працы як выгнанне непатрэбных і нялоўкіх рухаў пры рабоце, выпрацоўка правільных прыёмаў работы, увядзенне найлепшай сістэмы ўчота і кантроля і т. д. Усё гэта давала свае станоўчыя вынікі ў вырашэнні пытання паднятця прадукцыйнасці працы.

Асобна Ленін падкрэсліваў значэнне социялістычнага спаборніцтва. Ён пісаў:

«... Толькі социялізм, знішчаючы класы і, значыцца, заняволенне мас, упершыню адкрывае дарогу для спаборніцтва сапраўды ў масавым маштабе. І іменна совецкая арганізацыя, пераходзячы ад фармальнага дэмакратызма буржуазнай рэспублікі да сапраўднага ўдзелу працоўных мас у кіраўніцтве, упершыню ставіць шырока спаборніцтва» (там-жа стар. 455).

Ленін падкрэсліваў неабходнасць шырока асвятляць у друку ўсё тое лепшае, чаго дабіліся асобныя рабочыя, цэхі, фабрыкі, раёны ў практычнай рабоце па социялістычнаму будаўніцтву, усямерна заахвочваць тых, хто дабіўся лепшых вынікаў.

Партыя большэвікоў пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна бліскуча выканала і выконвае ўсе гэтыя ўказанні Леніна. У нашай краіне створана наша совецкая інтэлігенцыя, якая з'яўляецца кроўю ад крыві і плоццю ад плоці рабочага класа і сялянства. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для таго, каб кожны рабочы, кожны калгаснік мог стаць камандзірам вытворчасці. Пытанні социялістычнага ўчота і кантроля атрымалі шырокае і ўсебаковае развіццё, наша социялістычная вытворчасць з'яўляецца вытворчасцю планавай. І план, даны партыяй і ўрадам любой галіне нашай народнай гаспадаркі, з'яўляецца дырэктывай, якую з чэсцю выконвае ўвесь совецкі народ. Вялікія сталінскія пяцігодкі — гістарычны ўзор нашых социялістычных планаў і іх выканання.

Пытанням паднятця прадукцыйнасці працы партыя і ўрад заўсёды аддавалі каласальную ўвагу. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна наш рабочы клас і калгаснае сялянства дабіліся такой прадукцыйнасці працы, аб якой нават было цяжка і марыць у дарэволюцыйнай Расіі. Уся краіна ведае імёны людзей— Стаханава, Крываноса, Бусыгіна, Смятаніна, Марыі Дземчанка і іншых, паказаўшых небывалы ўздым прадукцыйнасці працы, які немагчым ні ў адной капіталістычнай дзяржаве.

Социялістычнае спаборніцтва расквітнела ва ўсёй нашай краіне. Стаханаўскі рух абагаціўся новай вышэйшай формай социялістычнага спаборніцтва—рухам многастаночнікаў, лішні раз падкрэсліваючым, якія бязмежныя перспектывы для росту прадукцыйнасці працы дае социялізм.

Ленін вучыць, што барацьбу з усякага роду разбэшчанасцю, недысцыплінаванасцю і разлажэннем «нельга весці толькі прапагандай і агітацыяй, толькі арганізацыяй спаборніцтва, толькі адборам арганізатараў —барацьбу трэба весці і прымусам» (там-жа, стар. 460). У артыкуле «Як арганізаваць спаборніцтва» Ленін патрабаваў бязлітаснай барацьбы супроць усіх тых, «якія цяпер хацелі-б адносіцца да народнай фабрыкі, да фабрыкі, перайшоўшай ва ўласнасць народа, паранейшаму з пункту погляду адзінага помыслу: «урваць кавалак пабольш і ўцячы» (Ленін. т. XXII, стар. 163). Усіх гэтых людзей, як і ўсіх багатых, жулікаў, дармаедаў і хуліганаў, Ленін бязлітасна бічаваў, як «перажыткі праклятага капіталістычнага грамадства... адкіды чалавецтва... безнадзейна гнілыя і амярцвеўшыя члены... заразу, чуму, язву, пакінутую социялізму ў спадчыну ад капіталізма» (там-жа, стар. 163).

Ленін высмейваў дабрадушнасць і мяккасардэчнасць у адносінах да ўсякага роду лодыраў, рвачоў, да ўсіх тых, хто з'яўляецца носьбітам дробнабуржуазнага анархізма і недысцыплінаванасці. Ён патрабаваў, каб усякага, «...хто нарушае працоўную дысцыпліну ў любой гаспадарцы, у любой справе... умець знаходзіць, аддаваць пад суд і караць бязлітасна».

У сучасны момант, калі капіталістычны свет узрушан другой імперыялістычнай вайной, калі капіталістычныя дзяржавы паставілі на службу вайне ўсю народную гаспадарку і да канца завінцілі прэс капіталістычнай эксплаатацыі —совецкі ўрад у інтарэсах народаў СССР абавязан яшчэ больш узмацніць гаспадарчую і эканамічную магутнасць нашай социялістычнай дзяржавы. Таму задача барацьбы з элементамі недысцыплінаванасці, лодырніцтва, рвацтва, дармаедства і хуліганства набывае асаблівае значэнне і вастрыню.

Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў (26 чэрвеня 1940 года), аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай і некамплектнай прадукцыі (10 ліпеня 1940 года) і аб крымінальнай адказнасці за дробныя пакражы і хуліганства (10 жніўня 1940 г.) накіраваны супроць лодыраў, летуноў, зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны, супроць дробнабуржуазных тэндэнцый, безадказных, нядбайных адносін да дзяржаўнага дабра.

У якасці асноўнай умовы паспяховага вырашэння задач, якія стаяць перад совецкай уладай у справе социялістычнага будаўніцтва, Ленін ставіў умацаванне дыктатуры пролетарыята, без якой не магло быць пабеданоснага руху наперад.

«Дыктатура ёсць жалезная ўлада, рэволюцыйна-смелая і быстрая, бязлітасная ў падаўленні як эксплаататараў, так і хуліганаў» (там-жа, стар. 459).

Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна рабочы клас, калгаснае сялянства, совецкая інтэлігенцыя штодзённа і штогадзінна ўмацоўваюць сваю пролетарскую дзяржаву. Дыктатура пролетарыята — совецкая ўлада зараз моцна як ніколі. Сіла і магутнасць нашай пролетарскай дзяржавы запісана ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі, паказваючай шлях усяму прыгнечанаму чалавецтву.

Н. Чорны.

ПРАВЯРАЕМ ВЫКАНАННЕ ЎКАЗА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 26 ЧЭРВЕНЯ

Няўхільна выконваць указ ад 26 чэрвеня

З часу выдання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года значна ўмацавалася працоўная дысцыпліна на прадпрыемствах і ва ўстановах нашай вобласці. Аднак, ёсць яшчэ рад арганізацый і прадпрыемстваў, на якіх Указ выконваецца нездавальняюча.

Беластоцкай абласной пракуратурай за апошнія два месяцы праверана выкананне Ўказа на 83 розных прадпрыемствах і ва ўстановах вобласці. Вынікі праверкі гавораць аб радзе фактаў нарушэння закона.

У Ваўкавыскім райфінаддзеле 1-га кастрычніка прадаставілі чарговы водпуск старшаму інспектару Тычыніну не на 12 дзён, як гэта патрабуе закон, а «з 1-га кастрычніка па 1-е лістапада».

Прадастаўленне чарговых водпускаў больш устаноўленага законам тэрміну мела месца ў Беластоцкім горхарчпромгандлі (дырэктар тав. Кіслік), на дайлідскім фанерным заводзе № 7 (дырэктар тав. Шчэгалючін), на лесапільным заводзе № 3 аблбудтрэста (дырэктар тав. Пятроўскі) і радзе іншых прадпрыемстваў.

Праверкай таксама ўстаноўлена, што на некаторых прадпрыемствах прадастаўляюцца кароткатэрміновыя водпускі за свой кошт, што, па сутнасці, з'яўляецца легалізацыяй прагулаў.

Да гэтага часу ў радзе месц не ўпарадкаваны ўчот яўкі на работу і ўходу з работы, не ўлічваецца ўшчыльненне рабочага дня і іншае.

На такіх прадпрыемствах, як лесапільны завод № 2 горпромкамбіната, у арцелях цырульнікаў «Перамога», арцелі імені 17 верасня і асабліва ў гандлёвых арганізацыях горада Беластока ўчот яўкі на работу да апошняга часу адсутнічаў.

За апошні час рэзка знізілася колькасць выпадкаў патурання прагульшчыкам і нясвоечасовай перадачы матэрыялу на іх судовым органам. Аднак у радзе раёнаў такія факты ёсць і цяпер. У Бранскім раёне ў кастрычніку дырэктар бальніцы Цівінскі санітару Андрэю Падлецкаму за прагул на тры гадзіны абвявіў суровую вымову. Незаконны загад апратэставан раённым пракурорам. Прагульшчык перадан суду, а дырэктар таксама прыцягваецца да судовай адказнасці.

У Монькаўскім раёне мелі месца абураючыя факты. Двое рабочых аднаго будаўніцтва з'явіліся на работу ў п'яным выглядзе. Яны не маглі працаваць і звярнуліся да загадчыка фельчарска акушэрскага пункта станцыі Монькі Зеленава. Апошні абодвум выдаў «даведкі» на вызваленне па хваробе. Атрымаўшы такія «дакументы», дэзарганізатары вытворчасці пайшлі дамоў. Той жа фельчар Зеленаў перацягнуў да сабе на пасаду санітаркі работніцу Васілеўскую, якую асудзілі за лятунства. Раённая пракуратура Монькаўскага раёна прагульшчыкаў і іх патуральніка Зеленава прыцягнула да адказнасці.

На фанерным заводзе № 7 у Дайлідах у выніку дрэннай работы сталовай рабочыя за час абедзенага перапынку не паспяваюць паабедаць.

Дырэктар беластоцкіх мылаварных заводаў Масюк барацьбу за працоўную дысцыплну ажыццяўляў пасвойму; за прагулы ставіў толькі на віх. За патуранне прагульшчыкам Масюк прыцягнут да адказнасці.

На пракуратуру партыя і ўрад усклалі сур'ёзныя і адказныя задачы. Гэтыя органы рэволюцыйнай законнасці заклікаы зорка сачыць за чоткім і паслядоўным выкананнем Указа, сурова караць кожнага, хто імкнецца паслабіць большэвіцкі парадак на нашых прадпрыемствах і ва ўстановах.

Гарсшкін,

начальнік аддзела агульнага нагляду пракуратуры беластоцкай вобласці.

«0»

Чаму адстае Монькаўская МТС

Калі ў Монькаўскім райкоме партыі і райвыканкоме заходзіць гутарка аб машынна - трактарнай станцыі, тут робяць безнадзейны жэст рукой. «Не клеіцца ў нас з работай МТС», — заяўляюць у райкоме. І сапраўды, МТС увесь час знаходзіцца ў прарыве.

Монькаўская МТС з'яўляецца адной з адстаючых у вобласці. Гадавы план трактарных работ выканан ёю ўсяго на 62 процанты. Малацьба калгасных хлябоў зацягваецца. З кожным днём расце лік прастояў машын. Яшчэ горш абстаіць справа з працоўнай дысцыплінай. Толькі за апошні час на 6 трактарыстаў пераданы справы ў народны суд за нарушэнне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. У чым справа? Дзе прычыны такога адставання? Прычына гэтаму перш за ўсё ў тым, што ў МТС сярод рабочых і специялістаў адсутнічае масава палітычная работа. Аб калектыве МТС у раёне ўспамінаюць толькі пры вырашэнні афіцыяльных пытанняў.

Амаль побач з раённымі арганізацыямі знаходзіцца калгас імені Першага мая. У самы разгар малацьбы ў гэтым калгасе на таку тры дні прастаяла складаная малатарня, а ў калгасе «Новае жыццё» хлеб аставаўся немалочаным. Прычына ўсяму гэтаму — нераспарадкальнасць.

На загоне астанавіўся трактар. Хутка сюды прыехаў брыгадзір тав. Савін. Пасля высвятлілася што ў трактары неабходна замяніць дэталь. Між тым яе на складзе не аказалася. Машына зноў прастаяла тры дні. Яшчэ больш выпадкаў прастояў бывае з прычыны адсутнасці гаручага. Наогул, гаручае ў МТС паступае з вялікімі перабоямі.


Дырэктар МТС тав. Герасімчук і яго намеснік па палітычнай часці тав. Шылейка — рэдкія госці ў трактарных брыгадах. Брыгадзір тав. Савін заяўляе: «Едзе міма атрада дырэктар: крычыш яму, каб спыніўся, а ён памахае рукой і едзе». Трактарысты бачаць сваіх кіраўнікоў вельмі рэдка. Сходаў і нарад у атрадах не бывае. Тут не выпускаюць насценгазет. Социялістычнае спаборніцтва сярод трактарыстаў адсутнічае.

Дрэнна і са снабжэннем трактарных атрадаў запаснымі часткамі і гаручым. З-за адсутнасці нязначных запасных частак бываюць вялікія прастоі. Барацьба за эканомію гаручага таксама адсутнічае. І як вынік — у атрадах няма эканоміі бензіну і газы.

Да цэнтральнай сядзібы МТС ад раённага цэнтра 20 кілометраў. Але кіраўнікі раёна тут бываюць вельмі рэдка, а калі і прыязджаюць, то ў справы не ўнікаюць. Прыязджаюць толькі тады, калі трэба абмеркаваць пытанне аб рабоце МТС. Прыедуць, абследуюць за адзін дзень і назад едуць.

Загадчык Беластоцкага аблза тав. Нішчык часта звоніць у райком і райвыканком, і кожны раз ён абураецца адставаннем МТС. Аднак і сам тав. Нішчык мала практычнай дапамогі аказвае МТС у яе рабоце.

В. Гарбанёў.



На абласной выстаўцы прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў г. Брэсце. Экскурсанты аглядаюць экспанаты сельскай гаспадаркі.

Фота В. Лупейка. Фотахроніка БЕЛТА.

З А Р У Б Я Ж О М

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Германскае камандаванне паведамляе: Спроба непрыяцеля ўвесці пашкоджанае судно «Эмпрэс оф Брыты» закончылася няўдачай. Сёння параход быў патоплен. Дзеянні авіяцыі былі накіраваны галоўным чынам супроць размешчаных каля Лондана аэрадромаў і галоўнага арсенала ваенна-паветраных сіл у Хенлоў. Многія антары і будынкі загарэліся. На паўднёвым узбярэжжы Англіі моцна пашкоджана буйная электрастанцыя. Паблізу Йорка скінутыя бомбы выклікалі крушэнне поезда. Ноччу наша авіяцыя бамбардыравала прамысловыя збудаванні Бірмінгама і Ковентры, а таксама порт Ліверпуля.

Англійскія самалёты паявіліся над германскай тэрыторыяй толькі з наступленнем цемры. Прадпрынятая спроба атакаваць прамысловы аб'ект не ўдалася. Асколак бомбы злёгку закрануў доменную печ, але не пашкодзіў яё. Учора працїўнік страціў 29 самалётаў, германская авіяцыя — 9.

БЕРЛІН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, адзін германскі самалёт атакаваў паўночна-заходнее Ірландыі англійскі караван суднаў, складаўшыйся з 26 гандлёвых параходаў, 6 эсмінцаў і 8 патрульных суднаў. Нанесены моцныя пашкоджанні двум гандлёвым параходам, водазмяшчэннем па 8 тысяч тон кожны. Абодва параходы спынілі свой далейшы шлях.

Як дадаткова стала вядомым, у ноч на 27 кастрычніка ўзніклі многалікія пажары і ўзрывы ў Грынвічы, Луішэм, Дэткордзе і Бермондсі.

Германскія бамбардыроўшчыкі, стартаваўшыя з Нарвегіі, паспяхова бамбардыравалі два англійскіх аэрадромы ў паўночна-усходняга ўзбярэжжа Шатландыі. На аэрадроме Вікт пачаліся буйныя пажары. На аэрадроме Лосімаўс, ля ўвахода ў заліў Мары-Фет, разбурана большасць ангараў.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора галоўныя атакі германскай авіяцыі былі накіраваны на паўночна-заходнюю частку Англіі і цэнтральныя раёны. Паміма гэтага, бомбы былі скінуты ў многалікіх пунктах і ў іншых частках Англіі і Паўднёвага Уэльса. Бамбардыроўкай прычынен некаторы ўрон у раёне ракі Мерсей і ў адным з гарадоў Цэнтральнай Англіі, дзе ўзнікла некалькі пажараў. У іншых пунктах прычынен нязначны ўрон жылым дамам.

Спробы непрыяцеля зрабіць масавы налёт на Лондан закончыліся беспаспяхова. Толькі некалькім самалётам удалося дасягнуць горада. Урон нязначны. На працягу дня было знішчана 8 непрыяцельскіх самалётаў. Англійская авіяцыя страціла 6 знішчальнікаў.

Як зараз удалося выясніць, 27 кастрычніка ў паветраных баях было збіта 10 германскіх самалётаў, столькі-ж англійскіх не вярнуліся на свае базы.

ЛОНДАН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, раніцой 28 кастрычніка цяжкія бамбардыроўшчыкі англійскай авіяцыі зрабілі паўтарагадзінны налёт на Берлін. У цэнтры горада былі атакаваны чыгуначная і электрычная станцыі.

Змест зварота Рузвельта да Пэтэна

ЛОНДАН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Па словах газеты «Сандэй дыспетч», Рузвельт у сваім звароце папярэдзіў Пэтэна, што ЗША не акажуць ніякай дапамогі Францыі, калі яна будзе супрацоўнічаць з Германіяй. Рузвельт выразіў цвёрдую надзею, што Францыя не ўступіць у вайну супроць Англіі і не акажа Германіі ваеннай дапамогі. Рузвельт просіць таксама падрабязна інфарміраваць яго аб мэтах і намерах Францыі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ГРЭЦЫІ

ЛОНДАН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на паведамленне амерыканскага агенцтва Трансрадыё, перадае, што паблізу вострава Корфу адбыўся бой паміж італьянскімі і грэцкімі ваеннымі караблямі. Бой адбыўся ў рэзультаце спробы італьянцаў высадзіць свае войскі на гэтым востраве.

Сёння ў 9 гадзін раніцы зенітныя батарэі Афін адкрылі агонь па самалётах, якія паявіліся над сталіцай Грэцыі.

Камюніке грэцкага камандавання

АФІНЫ, 28 кастрычніка. (ТАСС). Грэцкае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае камюніке камандавання грэцкіх узброеных сіл: «Італьянскія ваенныя сілы сёння ў 5 гадзін 30 мінут раніцы атакавалі нашы ўмацаваныя сектары на грэка-албанскай граніцы».

ДА ПЫТАННЯ АБ АНГЛІЙСКАЙ ДАПАМОЗЕ ГРЭЦЫІ

ЛОНДАН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што па звестках з аўтарытэтных кругоў, Англія намерана выканаць свае абавязацельствы ў адносінах да Грэцыі, аб якіх было заяўлена у палаце абшчын 13 красавіка 1939 года. Аднак у цяперашні момант англійскі ўрад не распалагае якімі-небудзь звесткамі аб пачатку ваенных дзеянняў паміж Італіяй і Грэцыяй. Калі гэтыя ваенныя дзеянні пачаліся, то Грэцыя можа разгледжвацца як саюзніца Англіі.

Сустрэча Гітлера з Мусаліні ва Фларэнцыі

БЕРЛІН, 28 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што сёння раніцой Гітлер у суправаджэнні Рыбентропа прыбыў ва Фларэнцыю. На вакзале Гітлера сустракалі Мусаліні і Чыяна.

—о—

ЗВАРОТ МЕТАКСАСА

НЬЮ-ЙОРК, 28 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню афінскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэцкі прэм'ер Метаксас звярнуўся да насельніцтва з адозвай. У адозве гаворыцца, што Італія патрабавала ў 3 гадзіны раніцы перадачы ёй часткі грэцкай тэрыторыі. Для акупацыі гэтай часткі тэрыторыі, гаварылася ў італьянскай ноце, у 6 гадзін раніцы будуць двінуты італьянскія войскі. «Я адказаў, — гаворыцца ў звароце, — італьянскаму пасланніку, што я разгледжваю патрабаванне і метад, які прымяніла Італія, як аб'яву вайны». У заключнай частцы зварота гаворыцца, што ў цяперашні час асноўнай задачай з'яўляецца вайна.

Па паведамленню белградскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэцкі пасланнік ў Белградзе заявіў аб «становішчы вайны» паміж Грэцыяй і Італіяй.

—о—

Агенцтва Стэфані аб інцыдэнтах на грэка-албанскай граніцы

РЫМ, 28 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе з Тыраны (Албанія), што албанская газета «Томоры» паведамляе аб новых інцыдэнтах ва многіх месцах грэка-албанскай граніцы, акрамя тых, якія адбыліся каля Карыцы і ў порце Эда. За апошнія двое сутак у 6 пунктах граніцы паміж возерам Прэспа і Коніспаль былі адзначаны перасоўванні груп людзей, узброеных вінтоўкамі. Адзін пагранічны пост на поўнач ад Карыцы затрымаў 6 чалавек, якія пранікілі амаль на адзін кілометр углыб албанскай тэрыторыі. На пагранічным праходзе Карвія, па дарозе паміж Гінакасцер (Албанія) і Яніна (Грэцыя) сотня грэцкіх студэнтаў пад кіраўніцтвам сваіх прафесараў зрабіла варожую Італіі маніфестацыю. Грэкі фактычна закрылі тут граніцу для ўсіх албанскіх сялян, якія маюць палі на грэцкай тэрыторыі, куды яны накіроўваліся працаваць кожную раніцу.


—о—

Становішча ў Афінах

АФІНЫ, 28 кастрычніка. (ТАСС). У горадзе ў 7 гадзін раніцы аб'яўлена паветраная трывога. Увесь горад знаходзіўся на нагах. Газеты сёння ў Афінах не выйшлі.

АФІНЫ, 28 кастрычніка. (ТАСС). У Грэцыі адбываецца мабілізацыя прызыўных узростаў 1917—1940 гадоў.

АФІНЫ, 28 кастрычніка. (ТАСС). Сёння ў 10 гадзін 15 мінут раніцы два італьянскіх самалёты праляцелі над Афінамі. Абстралян Татой. Адзін самалёт збіт над Элеўсінам (паўночна-заходнее Афін).



Зенітныя кулямёты на брытанскім тарпедным кацеры.

Фота ТАСС.

Захворванні чумой у Манчжурыі

У японскіх газетах 26 кастрычніка г.г. апублікавана паведамленне агенцтва Домей Цусін наступнага зместу: «Міністр аховы здароўя 25 кастрычніка склікаў спецыяльную канферэнцыю медыцынскіх экспертаў для абмеркавання мерапрыемстваў па прадухіленню распаўсюджання чумы, якая ўспыхнула ў Паўночнай Манчжурыі. З раёнаў Нунган і Тунгаяо эпідэмія перакінулася ў раёны на паўночны захад ад Сіньцзіна. Па афіцыяльных даных, ёсць 850 выпадкаў захворванняў. Міністр аховы здароўя Японіі камандыруе ў раёны эпідэміі свайго эксперта. У сувязі з тым, што штодзённа каля 7 тысяч чалавек перасякаюць праліў паміж Фузанам і Сімонасекі (з абодвух бакоў), апасаюцца, што хвароба можа быць занесена і ў Японію. У сувязі з немагчымасцю стварэння карантына ў Сейсіне, Андуне, Хімзане ў далейшым агляд пасажыраў, якія едуць у Японію з Паўночнай Манчжурыі, будзе рабіцца ў Сіньцзіне. Гэта першая эпідэмія чумы, якая паразіла такую вялікую плошчу, з 1923 года.

—о—

Мерапрыемствы савецкага ўрада па прадухіленню занясення чумы з Манчжурыі ў СССР

У сувязі з масавымі выпадкамі захворвання чумой у Манчжурыі, Соўнарком Саюза ССР, у мэтах прадухілення занясення чумы з Манчжурыі ў межы СССР, прыняў наступную пастанову:

1. Устанавіць карантын на чыгуначных станцыях Адпор і Пагранічная, а таксама ў партах Уладзівастоцкім і Нікалаеўску-на-Амуры для ўсіх асоб, якія прыбываюць з Манчжурыі і з партоў Расіна, Сейсіна і іншых пунктаў Карэіі.

2. Устанавіць пільны санітарны агляд прыбываючых ва ўказаныя пункты тавара-пасажырскіх параходаў, паяздоў і грузаў.

3. Абавязаць Наркамат аховы здароўя СССР, Народны Камісарыят унутраных спраў СССР, Прыморскі, Хабараўскі крайвыканкомы і Чыцінскі аблвыканком забяспечыць недапушчэнне ніякіх выключэнняў у справе карантыравання пасажыраў без спецыяльнага ў кожным выпадку дазволу СНК СССР. (ТАСС).

Рэспубліканская нарада палітасветработнікаў

Учора ў Беластоцкім Доме партыйнай асветы адкрылася рэспубліканская нарада палітасветработнікаў заходніх абласцей БССР, скліканая Народным Камісарыятам асветы Беларускай рэспублікі.

У парадку дня нарады — даклад аб становішчы палітасветработы ў заходніх абласцях БССР, задачы палітасветустаноў у прадстаячай выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і работа па асобных секцыях.

На нараду прыбыла каля 170 чалавек палітасветінспектараў раённых аддзелаў народнай асветы, загадчыкаў раённых дамоў соцкультуры і загадчыкаў хат-чытален.

Нараду адкрыў намеснік наркома асветы БССР тав. Чэрноў. З дакладам аб становішчы палітычна-асветнай работы ў заходніх абласцях рэспублікі выступіў начальнік упраўлення палітасветработы Народнага Камісарыята асветы БССР — тав. Мыслевец. Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Да 9 гадзін вечара выступіла ў іх 10 чалавек, сярод іх начальнік бібліятэчнага ўпраўлення Народнага Камісарыята асветы БССР тав. Злоцін.

На нарадзе прысутнічае загадчык сектара культуры і мастацтваў ЦК КП(б)Б тав. Обловацкая.

Сёння і заўтра нарада працягвае сваю работу.

Школы фабрычна-заводскага абучэння ў Беластоцкай вобласці

На апошнім пасяджэнні Беластоцкага аблвыканкома прынята рад важных рашэнняў па рэалізацыі пастаноў урада аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР.

У Беластоцкай вобласці будуць створаны тры школы фабрычна-заводскага абучэння: у Беластоку — з кантынгентам на 300 чалавек, у Ломжы—на 160 і ў Сакольцы — на 150. Акрамя таго, у Беластоку ствараецца чыгуначнае вучылішча.

Зацверджаны саставы камісій, створаных у гарадах і раённых цэнтрах вобласці, для правядзення прызыву моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння.

Вялікі попыт на выбарчую літаратуру

У апошнія дні кліенты кніжнага магазіна задаюць прадаўцам адны і тыя-ж пытанні.

— Ці ёсць яшчэ брашура з дакладам таварыша Сталіна на VIII з'ездзе Советаў?

— Выпішыце, калі ласка, брашуру з прамовай таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе ў Маскве.

— Ці можна купіць 5 экземпляраў Палажэння аб выбарах?

Беластоцкі кніжны магазін № 1 27 кастрычніка да вечара быў запоўнен людзьмі. За дзень яго наведала 2 тысячы чалавек. Усе яны прыходзілі ў магазін па адных і тых-жа справах — за пакупкай выбарчай літаратуры.

І так кожны дзень.

За час выбарчай кампаніі магазін наведала звыш 20 тысяч працоўных горада.

Толькі за апошнія дні магазін № 1 прадаў Палажэння аб выбарах на рускай мове 1,5 тысячы экземпляраў, на беларускай — 2 тысячы экземпляраў. Прадана 130 выбарчых бібліятэк, у каталазе якіх ёсць брашура з дакладам таварыша Сталіна на VIII Усесаюзным з'ездзе Советаў, брашура з прамовай таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе ў Маскве, кніга М. І. Калініна «Што дала савецкая ўлада працоўным», Канстытуцыя СССР, Канстытуцыя БССР, Палажэнне аб выбарах і іншыя. Усяго ў апошнія дні магазінам прадана каля 6 тысяч выбарчых брашур.

Попыт на палітычную літаратуру ўзрастае. Асаблівую цікавасць праяўляюць працоўныя на творы Леніна—Сталіна, Молатава, да матэрыялаў сесіі Вярхоўнага Совета СССР і т. д.

Магазін № 1 26 кастрычніка гадавы план выканаў на 103,6 процанта. Прадана літаратуры на 444 тысячы рублёў.

Работнікі 1-га кніжнага магазіна ў чэсць выбараў разгарнулі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва. Яны праводзяць вялікую работу па распаўсюджанню выбарчай літаратуры непасрэдна на выбарчых участках. Пачалі абход кватэр рабочых, абслугоўваюць удзельнікаў гарадскіх нарад. На нарадзе старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў выбарчых камісій горада прадана 700 экземпляраў выбарчых брашур. Найбольшую актыўнасць у распаўсюджванні літаратуры праяўляюць у магазіне № 1 работнікі тт. Эпштэйн, Снігевіч, Когель, Барыцкі і іншыя.

Вялікая работа па распаўсюджванню выбарчай літаратуры праводзіцца і работнікамі беластоцкага кніжнага магазіна № 2. Вывешана вітрына літаратуры, адкрыты дадатковыя кіёскі — адзін пры Доме партасветы, другі — пры клубе шарсцянікаў. Днямі кіёск адкрываецца пры горвыканкоме.

Усяго ў сістэме КОГІЗ'а працуе па нашай вобласці 7 магазінаў. Ва ўсіх арганізаван масавы продаж выбарчай літаратуры. У апошні час кніжныя магазіны КОГІЗ'а атрымалі брашур з Палажэннем аб выбарах 31 тысячу экземпляраў, брашур з дакладам таварыша Сталіна на VIII з'ездзе Советаў — 16 тысяч экземпляраў, Канстытуцыю СССР — 11 тысяч экземпляраў. Атрымана многа іншай літаратуры.

В. Дзям'янаў.

Нам. адказнага рэдактара **Г. М. КУЗНЯЦОЎ.**

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ.—84. Тыраж—10.000 экз. Друкарня Беластокдруку.